Я ласкай гасціннай
узрушаны,
Гукаю шчасліваму выраю:
-Мяне Беларусь
збеларушвае,
-Чаруючы мовай
шчыраю…

*М.Братан*

# Дэвіз

**Жыві, шукай, усё рабі як след,**

**Каб на Радзіме твой свяціўся**

**след.**



*С.Г[illegible]йскі*

# Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле “Сказы з аднароднымі членамі: будова, значэнне, ванне” ў кан е ыялогу культ





# Мэта

**Падагульніць і сістэматызаваць веды пра сказы з аднароднымі членамі, іх будову, значэнне і ўжыванне.**

## Задачы:

- **мы будзем удасканальваць …**
- **мы будзем развіваць…**
- **мы далучымся да …**

## Дапоўніце

**Сказы, якія складаюцца з галоўных** *(ці аднаго з іх)* **і даданых членаў сказа** *(што не з'яўляецца абавязковым)* **…**

1) ***Еш запечаную гусь…***
2) ***Нашы продкі бралі ваду з крыніц…***

# Ускладнены сказ

- Аднародныя члены сказа
- Адасобленыя члены сказа
- Зваротак
- Параўнальны зварот
- Пабочныя словы, словазлучэнні, сказы
- Устаўныя канструкцыі

# Аднародныя члены сказа

- выконваюць адну сінтаксічную функцыю
- адносяцца да аднаго і таго ж слова (словазлучэння) у сказе
- утвараюць рад (рады) аднародных членаў
- характарызуюцца інтанацыяй пералічэння
- звязваюцца злучальнай ці бяззлучнікавай сувяззю
- звычайна выражаюцца аднымі і тымі ж часцінамі мовы

# Аднародныя члены сказа

- могуць быць як галоўныя, так і дададныя члены сказа
- маюць пры сабе адпаведныя знакі прыпынку
- могуць мець пры сабе абагульняльнае слова
- у ролі абагульняльных слоў могуць ужывацца азначальныя і адмоўныя займеннікі, прыслоўі, назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы, спалучэнні слоў



**Галоўнае ў нашым характары – гасціннасць добрага да добрых.**

*У.Караткевіч*

*«Зямля пад белымі крыламі»*

# САМАСТОЙНАЯ ПРАЦА



традыцыі

<table>
<tr><th colspan="2">АЗНАЧЭННІ БЫВАЮЦЬ</th></tr>
<tr><th>аднародныя</th><th>…</th></tr>
<tr><th colspan="2">АДНАРОДНЫЯ АЗНАЧЭННІ</th></tr>
<tr><td colspan="2">Адносяцца да паяснёнага слова, абазначаюць адметныя прыкметы парадметаў ці розныя прыкметы аднаго прадмета, звязаныя паміж сабой злучальнымі злучнікамі і інтанацыяй пералічэння.</td></tr>
<tr><th colspan="2">Азначэнні аднародныя і аддзяляюцца коскамі:</th></tr>
<tr><td>1.абазначаюць адметныя прыкметы прадметаў</td><td>…. , …. ,…. бярозка расла пры дарозе.</td></tr>
<tr><td>2.</td><td>А на дварэ не раненька, пала раса сцюдзёная, мядовая, жамчужная.</td></tr>
<tr><td>3. пасля адзіночнага азначэння ідзе развітае азначэнне (зварот)</td><td>Шалёны, |акрылены …| вецер не сціхаў.</td></tr>
<tr><td>4.дапасаваныя азначэнні пасля паяснёнага слова</td><td>Прыйшлі Калядкі, …. , …… .</td></tr>
<tr><th colspan="2">НЕАДНАРОДНЫЯ АЗНАЧЭННІ</th></tr>
<tr><td colspan="2">Характарызуюць прадмет з ….. бакоў, адсутнічае …. сувязь і інтанацыя … .</td></tr>
<tr><td>1.</td><td>Беларускія тканыя ручнікі выраблялі народныя майстры.</td></tr>
<tr><td>2.характарызуюць прадмет з розных бакоў</td><td>Вялікімі … жорнамі малолі зерне.</td></tr>
<tr><td>3.</td><td>На стале ляжаў духмяны бабулін хлеб.</td></tr>
<tr><th colspan="2">КОСКА ПАМІЖ АДНАРОДНЫМІ ЧЛЕНАМІ СКАЗА ставіцца:</th></tr>
<tr><td>1. О, О, О.</td><td>Госцю прапанавалі …. , …. , ….. .</td></tr>
<tr><td>2.</td><td>Госця вясною частуюць мядком, а ўвосень – малачком.</td></tr>
<tr><td>3. і О, і О, і О.</td><td>На Беларусі і ткацтва, і … , і … здаўна былі відамі народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.</td></tr>
<tr><td>4.</td><td>Беларусы, і рускія, і ўкраінцы маюць сваю культуру.</td></tr>
<tr><td>5. О і О, О і О.</td><td>Асобую ролю ў інтэр’еры традыцыйнага жылля беларусаў адыгрывалі печ і … , покуць і …. .</td></tr>
<tr><th colspan="2">КОСКА ПАМІЖ АДНАРОДНЫМІ ЧЛЕНАМІ СКАЗА не ставіцца:</th></tr>
<tr><td>1.</td><td>На калядную куццю гатавалі верашчаку і …… .</td></tr>
<tr><td>!!! 2. ні О ні О. (фразеал.) і О і О.</td><td>Ні …. ні…. .</td></tr>
<tr><th colspan="2">АБАГУЛЬНЯЛЬНЫЯ СЛОВЫ пры аднародных членах сказа</th></tr>
<tr><th colspan="2">Запісаць схемы, расставіць знакі прыпынку, выканаць сінтаксічны разбор</th></tr>
<tr><td>1.У нас ёсць шматдзённыя святы Каляды Масленіца Гуканне вясны.</td><td>[ ].</td></tr>
<tr><td>2.Бульба гародніна бочкі дзежкі ўсё захоўвалася ў склепе.</td><td>[ ].</td></tr>
<tr><td>3.Ва ўсім ў святах і гульнях у песнях і замовах у абрадах і звычаях адлюстроўваецца характар беларусаў.</td><td>[ ].</td></tr>
</table>



# Інтэрактыўная гульня
# «Аднародныя члены сказа ў культуразнаўчым кантэксце»

| | | | |
|---|---|---|---|
| ТРАПІЎ У НЕРАТ… | 100 | 200 | 300 |
| ПЛЁТКІ СТАРОЙ ЦЁТКІ | 100 | 200 | 300 |
| ДЗВЮХ САРОК ЗА ХВОСТ ТРЫМАЦЬ | 100 | 200 | 300 |
| БЕЗ КАВАЛАЧКА ХЛЕБА КЕПСКАЯ БЯСЕДА | 100 | 200 | 300 |



## Трапіў у нерат…

10



# Што апрануць мужчыне?

# Андарак, чуйка, панёва

***Чуйка**- мужчынская вопратка. Уборы жанчыны адрозніваліся разнастайнасцю, сярод іх андарак (спадніца), панёва (спадніца).*



# Трапіў у нерат…

20

**Суаднесці складальнікі талерантнасці з прыказкамі:**

**а) пачуццё асабістай годнасці- 1) У сваім краі як у раі.**

**б) любоў да сваёй зямлі- 2)Усякая птушка сваё гняздо бароніць.**

**в) самаадданасць- 3) Шануй сябе, то і людзі будуць шанаваць.**



***А-3, Б-1, В-2. Беларус - чалавек спакойны, вытрыманы, з пачуццём асабістай годнасці і пачуццём любові да Радзімы .***



# Трапіў у нерат…

30



**Кто владеет :**

**1.кузнечным делом?**

**2.ремеслом каменщика?**

**3.ремеслом кожевника?**

**4.ремеслом изготовления деревянной посуды?**

**А па-беларуску адным словам!**

***1. каваль, 2.муляр, 3.гарбар, 4. бондар***



# Плёткі старой цёткі

10



**Ці праўда, што паміж абагульняльным словам і аднароднымі членамі існуюць рода – відавыя паняцці?**

***Так.***



## Плёткі старой цёткі

20

**Ці праўда, што можна малоць жорнамі, языком, хвастом?**



***Так. Жорны – прылада для памолу зерня. Меле языком як цялё хвастом.***



## Плёткі старой цёткі

30

# Ці праўда, што словы гасцяванне і гасціннасць маюць аднолькавае значэнне?



***Не.*** *Гасцяванне- знаходжанне ў гасцях. Гасціннасць- гатоўнасць прыняць гасцей і пачаставаць іх; ветлівасць, сардэчнасць у абыходжанні з гасцямі.Беларуская гасціннасць – гэта ўсім гасціннасцям гасціннасць*



# Дзвюх сарок за хвост трымаць

10



**<u>Пазнай беларускае</u>:**

**1.Сем разоў адмер – адзін раз адрэж.**

**2.На сцябле дыні не вырасце баклажан.**

**3.У сваім доме - кожны кароль.**

**4.Галоўнае не хутка бегаць, а выбегчы загадзя.**

**5.Няма чаго чакаць панукі, калі работы поўны рукі.**

***Беларускія прыказкі: 1, 5.***



# Дзвюх сарок за хвост трымаць

20

**Выпраў памылку:**

***Я быў вельмі засмужаны няўдалым адказам і сваёй працай.***



***Засмужаны- (руск.) затянутый дымкой, мглой). Засмучаны- (руск.) огорчённый.***



# Дзвюх сарок за хвост трымаць

30

**Ці страцяцца некаторыя неаднародныя азначэнні ў сказе пры перакладзе з рускай мовы на беларускую:** ***Мама поставила на стол жидкое мучное блюдо, налила вкусного берёзового сока и пошла за свежим кленовым соком.***



***Так.*** *Жидкое мучное блюдо-верашчака, берёзовый сок-бярозавік, кленовый сок-кляновік.*



# Без кавалачка хлеба кепская бяседа

10



**<u>Запоўніце пропуск</u>:**

**Пчаліны мёд у беларусаў быў сімвалам …… Паводле павер'я, вораг, пачаставаўшыся мёдам, станавіўся добразычлівым, спакойным і забываў пра варожаць.** *(В.Цітоў)*

***Дружбы, сяброўства***



20

# Без кавалачка хлеба кепская бяседа

**<u>Да якога свята так старанна рыхтуюцца:</u>**

**Дваццаць тры стравы, а то і болей. Адной рыбы адзінаццаць гатункаў. Тут табе і ліны і ўюны, і смажаны ў смятане карась... А квас, які так смачна паруе грыбамі. Стол ламіцца...**

***Уладзімір Караткевіч "Калядная рапсодыя"***

***Наперадзе аж тры куцці***



## Без кавалачка хлеба кепская бяседа

30



**<u>Што можна есці</u>:**

**мачанка, пранік, гладыш, пражаніна, капытка, кулага.**

***Мачанка, пражаніна, капытка, кулага- стравы.***

***Пранік- брусок для выбівання бялізны.***

***Гладыш- гліняны посуд.***

# Дэвіз

## Жыві, шукай, усё рабі як след,

## Каб на Радзіме твой свяціўся

## след.



*С.Г [illegible] йскі*

Жытнёвае поле, лясы і азёры

крынічанька ў полі, а ў небе жаўрук



услухайся толькі, усё тут гаворыць

люблю цябе. Белая, Белая Русь.

(У.Карызна)

# Наш 8 «Б» клас



# Дамашняе заданне

## Жыві, шукай, усё рабі як след…

**Выпісаць з мастацкага твора 6 сказаў з аднароднымі членамі; выканаць пісьмовы сінтаксічны разбор сказаў.**